# Прадмова да другога выдання

Першае выданне “Балахоўцаў”, якое пабачыла свет вясною 2012 года, на моцы аб’ектыўных прычын не паспела шырока разысціся сярод тых, хто любіць беларускую гісторыю. Аднак некаторыя прафесійныя гісторыкі і аматары асобы генерала Станіслава Булак-Балаховіча кнігу ўсё ж такі прачыталі. Сярод водгукаў на кнігу найбольш папулярныя гучалі прыкладна так: “Я так і не высветліў, ці быў генерал беларускім героем, усё заблыталася яшчэ больш” і “А можа, не варта было друкаваць усю праўду, бо беларусы яшчэ занадта слабыя і ім патрэбны бясспрэчныя героі”. Для ўсіх, хто рыхтаваў да выдання гэтую кнігу, адказ відавочны — лепш заблытацца ў вялікай колькасці праўдзівых гістарычных фактаў, чым будаваць міфы на пяску. Бо веданне гісторыі хаця часам і “памнажае наш смутак”, аднак дае надзею на тое, што мы нарэшце асэнсуем яе, зробім адпаведныя высновы і падрыхтуемся да дыскусіі з апанентамі. У адваротным выпадку хісткія ідэалагічныя канструкцыі будуць лёгка разбураныя.

Усё гэта ў вялікай ступені тычыцца генерала Станіслава Булак-Балаховіча і ягонай ролі ў беларускай гісторыі. Генерал не быў ані палымяным патрыётам нацыянальнай дзяржаўнасці на чале войска беларускіх сялянскіх хлопцаў, ані бандытам з вялікай дарогі. Ён быў вайскоўцам, які найперш павінен быў забяспечыць выжыванне сваёй невялікай дзяржаве амаль без усіх атрыбутаў дзяржаўнасці — свайму войску. Войска С. Булак-Балаховіча не было рэгулярным ці кадравым. Сам генерал сцвярджаў, што ягоны добраахвотны атрад быў “мною ўзброенай і экіпіраванай” вайсковай часткай. Яго хутчэй можна параўнаць з кандацьерамі — правадырамі наёмных атрадаў у сярэднявечнай Італіі, якія самі вербавалі і распускалі ваяроў, самі ім плацілі і чынілі самі суд і расправу. Пры гэтым часам кандацьеры бралі ўладу ў гарадах, якія наймалі іх на службу. Так і вайсковыя поспехі атрада С. Булак-Балаховіча стваралі падкантрольныя яму міні-дзяржавы.

У пэўны момант палітыка для С. Булак-Балаховіча стала працягам ваенных дзеянняў, але іншымі сродкамі. Гэта не дзіўна, бо пасля стольках год вайны легітымнасць якой заўгодна ўлады была

пад пытаннем, і законнае права на ўладаранне тады заваёўвалася на полі бою. Бацька "Булак" сапраўды быў як "перакаці-поле", але з уласнай палітычнай праграмай барацьбы з Савецкай Расіяй. Палітычная праграма Народнай добраахвотніцкай арміі С. Булак-Балаховіча прадугледжвала вызваленне тэрыторыі былой Расійскай Імперыі па кавалках з улікам прынцыпу самавызначэння народаў. Але крывавы хаос, жахі і разбурэнні 1914—1920 гг. рабілі далейшае змаганне неапраўданым і патрабавалі ад супрацьстаялых бакоў шукаць міру. "Вайна ўсіх супраць усіх" можа часова парушаць тэзу К. Фон Клаўзевіца аб прымаце палітыкі над вайсковай справай, але не адмяняе палітыку ў якасці сродку дасягнення замірэння. Тым не менш, паражэнне Палескага паходу азначала не толькі палітычную паразу асабіста С. Булак-Балаховіча, але і адсутнасць беларусаў за сталом перамоваў у Рызе.

У больш шырокім кантэксце вайна, а тым больш вайна грамадзянская, уяўляе сабой крытычны момант, калі падзеі запускаюць інстытуцыянальныя сацыяльныя і палітычныя змены. Для нацыятварэння такія крытычныя моманты гісторыі складаюцца з кароткіх прамежкаў часу нявызначанасці, калі абіраецца той або іншы накірунак развіцця нацыянальнай дзяржавы. Крызісы грамадства, выкліканыя вайной, часта прапануюць палітычны момант або акно магчымасцей для пераменаў, якія пры іншых абставінах былі б значна менш верагоднымі. Ствараецца пільная патрэба рушыць наперад, як кажуць беларусы, "ідзі, пакуль дзверы адчыненыя, бо потым рады не дасі".

Крах Расійскай Імперыі прапанаваў палітычную ініцыятыву беларускаму нацыянальнаму руху праз нечаканае акно магчымасцей для рэалізацыі ідэі ўласнай дзяржавы. Правадыры нацыянальнага руху сталі перад простым пытаннем: што мы павінны зрабіць ужо зараз? Будаўніцтва незалежнай дзяржавы патрабавала ўсеабдымных, часта вымушаных або прыспешаных рашэнняў у сферах эканомікі, дзяржаўнага кіравання, дыпламатыі, культуры, вайсковай справы — усё гэта выклікала патрэбу максімальнай мабілізацыі назапашанага патэнцыялу беларускага нацыянальнага руху. Па сутнасці, сама наяўнасць акна магчымасцей яшчэ не гарантуе паспяховых сістэмных або інстытуцыянальных зменаў. Скарыстацца крытычным гістарычным момантам беларускаму нацыянальнаму руху маглі перашкодзіць як уласная "несаспеласць", так і жорсткае супрацьдзеянне іншых нацыя-

нальных праектаў або дзяржаў. Увогуле, для праекту Беларусі як тэатра працяглых ваенных супрацьдзеянняў геапалітычныя, дыпламатычныя і, нарэшце, вайсковыя фактары сталі асноўнымі.

Геапалітычнае супрацьстаянне вялікіх дзяржаў, калі Беларусь палярна разглядалася як плацдарм для прасоўвання сваіх інтарэсаў адпаведна на Захад або Усход, абумоўлівала знешні патэнцыял ў выглядзе вайсковых і эканамічных рэсурсаў, умоўна даступных для будаўніцтва беларускай дзяржаўнасці. Беларусь не была выключэннем у рэгіёне: так, напрыклад, карыстанне знешняй ваеннай і эканамічнай дапамогай Антанты або Нямеччыны было натуральнай з’явай для краін Балтыі. Што і казаць, калі нават для Польшчы толькі ўступленне ў баявыя дзеянні ўзброенай і арганізаванай у Францыі арміі генерала Ю. Галера нарэшце дапамагло перамагчы ўкраінскую армію ў зацятай барацьбе за Львоў. Таму ўдзел генерала С. Булак-Балаховіча ў барацьбе за беларускую дзяржаўнасць, няхай сабе нават у выглядзе кандацьера, не падаваўся ў той час такім безнадзейным праектам, якім ён можа падацца зараз, з адлегласці амаль цэлага стагоддзя.

Калі загаловак першага выдання кнгі цалкам адпавядаў назве самага вялікага змешчанага ў ёй твора — успамінам польскага афіцэра Станіслава Ліса-Блонскага, — то ў гэтым выданні “Балахоўцы” — гэта назва ўжо цэлага зборніка, які ўключае ў сябе невялікую манаграфію Юрася Юркевіча, уласна “Балахоўцаў” С. Ліса-Блонскага і цэлы шэраг успамінаў і дакументальных сведчанняў, у тым ліку і не друкаваных у папярэднім выданні, а таксама спіс усіх жаўнераў Асобнага атрада БНР на канец 1919 г. Даследаванне Ю. Юркевіча, прысвечанае спробам стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў у Балтыі цягам 1919 г., храналагічна знаходзіцца акурат перад успамінамі С. Ліса-Блонскага і іх дапаўняе. Такім чынам, чытач трымае ў руках зборнік, які амаль цалкам “закрывае” перыяд найбольш лёсавызначальных для беларускай дзяржаўнасці 1918 — 1920 гг., але ў перспектыве можа быць дапоўнены публікацыяй крыніц, звязаных з уплывам генерала на беларускі рух у пачатку 1920-х гг., ягонымі сувязямі з “Зялёным Дубам”, удзелам балахоўцаў у жыцці міжваеннай Заходняй Беларусі.

*Андрэй Вашкевіч, Андрэй Чарнякевіч, Юрась Юркевіч*